**УНЁСАК РОДУ КАРАТКЕВІЧАЎ У ЗАХАВАННЕ І ПАПУЛЯРЫЗАЦЫЮ ФАЛЬКЛОРУ**
**(*да 90-годдзя з дня нараджэння Уладзіміра Караткевіча*)**

---

***Таццяна Кабржыцкая***

## УЛАДЗІМІР КАРАТКЕВІЧ, ЯКІ ЗАЎЖДЫ «БЫЎ. ЁСЦЬ. БУДЗЕ»…

*У дадзеным артыкуле беларуска-украінская даследчыца вуснай і пісьмовай літаратуры, а таксама сябар і калежанка У. Караткевіча па айчыннай супольнасці пісьменнікаў і людзей мастацтва 1970–80-х гг., аналізуе асабістыя якасці і неўтаймавана вольны стыль жыцця і зносін класіка айчыннага прыгожага пісьменства з яго атачэннем, якія сведчаць перадусім пра незвычайнасць і знакавасць «феномену Караткевіча» для гісторыі краіны.*

***Tatiana Kabrzhitskaya***

## VLADIMIR KARATKEVICH, WHO HAS ALWAYS «BEEN. THERE ARE. HE WILL»…

*In this article, the Belarusian-Ukrainian researcher of oral and written literature, as well as a friend and colleague of Vladimir Karatkevich in the domestic community of writers and artists of the 1970–80s analyzes the personal qualities and unrestrained free lifestyle of this classic of national literature. The article analyzes the entourage of V. Karatkevich, which testifies to the unusualness and significance of the «phenomenon of Karatkevich» for the history of the country.*

Сябравалі мы сем’ямі, нават адзін час жылі ў адным доме ў суседніх пад’ездах. Уладзімір Караткевіч лічыў малодшага Петруся Рагойшу сваім хросным сынам. Амаль кожны дзень, ці пры сустрэчах, ці па тэлефоне, мы гутарылі, абмяркоўваючы горача і праблемы мастацкія, і пытанні выхавання. Валодзя марыў узяць на сябе адказнаць за здароўе нашых хлопцаў: выехаўшы на вёску, загартоўваць іх, вучыць плаваць, хадзіць з імі босымі па ранішняй халоднай расе...

Якім жа ён, дарагі дядзька Валодзя, застаўся ў памяці нашых Усевалада, Максіма, Петруся (мал. 1)? Вось вытрымка з эсэістычнай замалёўкі, напісанай імі некалі спецыяльна для газеты «Ракаўскі шлях» (кам. 1): «А хадзіць у госці да Уладзіміра Караткевіча, для нас дзяцькі Валодзі, які жыў у суседнім пад’ездзе нашага агульнага мінскага дома па вуліцы К.Маркса, 36, было цікава і незвычайна. Не толькі бываць у яго ў гасцях, а нават проста хадзіць, бо незвычайнасці пачыналіся ўжо ў ягоным пад’ездзе, дзе на кожнай лесвічнай пляцоўцы паміж паверхамі да батарэяў ацяплення былі прывязаны крэслы – такія старамодныя драўляныя крэслы з высокімі спінкамі, зрэшты, крыху розныя на выгляд, але аднолькава рыпучыя. На першы погляд, гэта ўспрымалася як забаўка. Ну, усе забаўкі на свеце – ці ж не праўда? – існуюць для дзяцей, дык напачатку мы з адчуваннем поўнага права часцяком залазілі на тыя крэслы і нават спрабавалі гушкацца – наколькі дазваляў дрот, што мацаваў ножкі да батарэі, а потым мы неяк убачылі, як на крэсле сядзіць і адпачывае старэнькая маці дзядзькі Валодзі і зразумелі, што гэта ён паставіў тыя крэслы для сваёй маці, каб ёй не так цяжка было падымацца дадому. А жылі Караткевічы на высокім пятым паверсе. І ўжо болей мы не гушкаліся.

А дзядзька Валодзя сам быў чалавек ва ўсім незвычайны – і ў сваіх паводзінах, учынках, манеры трымацца, гаварыць, смяяцца. Гэта мы, дзеці, тры родныя браты, заўважалі і ў Мінску, і падчас яго нярэдкіх наведванняў дзедавага дома ў Ракаве, дзе мы з бацькамі падоўгу жылі, асабліва ў вясенне-летні час. Незвычайны ён быў нават паставаю. У яго было нейкай асаблівай формы тулава: яно нагадвала грушу, перавернутую дагары. У яго не было жывата, як гэта часта бывае ў мужчынаў спелага веку. У яго былі вельмі аб’ёмныя грудзі – як мяхі аргана ў касцёле. І калі ён гаварыў – а гаварыў ён звычайна нягучна, – голас набываў моцы і пераканаўчасці, перагукваючыся ў грудзях своеасаблівым рэхам. Ну, а калі ўжо дзядзька смяяўся... Мы паміж сабою вырашылі, што крыху падобнымі, але зусім не такімі глыбокімі і сакавітымі галасамі гавораць і смяюцца добрыя мядзьведзі ў мультфільмах...



Малюнак 1 – В. Рагойша і Т. Кабржыцкая на фоне іх сямейнага партрэта 1980-х з трыма сынамі. Мінск, 2017. Фота В. Красуліна



Малюнак 2 – Ф. Янушкевіч. Дзе мой край? Грамадзянін (пахаванне Уладзіміра Караткевіча). Музей сучаснага выяўленчага мастацтва. Мінск (кам. 2)



Малюнак 3 – І. Міско. Памяці В. Караткевіча. Ракаў, 2020. Фота Д. Пятроўскага

Ягоным рабочым інструментам была чарнільная ручка – ён ёю пісаў і маляваў. Дакладней, ручак у яго было шмат, усе прыгожыя і, відаць, дарагія і дыхтоўныя, з пазалочанымі пёрамі. І – чорнае чарніла. Ён не прызнаваў модных на той час шарыкавых ручак, і нам, школьнікам, якіх настаўнікі прымушалі ў адпаведнасці з “арфаграфічным рэжымам” пісаць толькі чарнілам, гэта было няўцям. Сёння цяжка сказаць, чаго ў гэтым было больш – звычкі, кансерватызму ці любові да вытанчанага. А, магчыма, праяўлялася ў гэтым і нейкая інтуіцыя творцы. Тая самая, якая дала назву вершу-крэда і апошняму паэтычнаму зборніку: “Быў. Ёсць. Буду”. Тая самая, што давала яму самому адчуванне ўсласнай незвычайнасці, знакавасці для Беларусі. Быў, ёсць, будзе. Дастаткова хоць бы глянуць на аўтографы-дэдыкцыі на тых кніжках, што ён нам у свой час дарыў: літары чорным чарнілам з залатога пяра выглядаюць ярка і выразна. Як быццам толькі напісаныя...» [1, с. 43].



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

І з маіх успамінаў, таксама ў свой час надрукаваных у «Ракаўскім краі»: “Улетку 1994 г. да нас з Масквы прыехалі ў госці нашыя сваякі – уся сям’я Бадровых: мая стрыечная сястра Ірына Аляксандраўна, маці Бадрова-старэйшага і бабуля Бадрова-малодшага, жонка Бадрова-старэйшага Валя, дарэчы, беларуска па паходжанні. Мы арганізоўвалі для іх розныя экскурсіі, паказвалі ім знакамітыя куточкі нашай Беларусі. Найбольш іх прывабіла лагодная прыгажосць наваколля Ракаўшчыны, «беларуская Швейцарыя» у вобліку монькаўска-бузуноўскіх краявідаў.

Бадроў-малодшы ў гэта лета захапіўся творчасцю Уладзіміра Караткевіча, якога мы таксама чакалі ў Ракаве, каб пазнаёміць яго з Бадровымі. Не без падстаў спадзяваліся, што Бадроў-старэйшы напіша для “Мосфильма” кінасцэнарый паводле нейкага яго твора. Але, як вядома, планы ў Караткевіча скаліся інакш... Наш Максім цэлымі днямі, а то і па вечарах чытаў і перакладаў на рускую мову свайму аднагодку Сяргею “Чорны замак Альшанскі”. Хлопцаў нават нельга было даклікацца на абед, справакаваць на самадзейныя спектаклі, якія мы часцяком ставілі па сцэнарыі Ірыны Аляксандраўны» [2]. І, калі прынеслі неспадзявана трагічную тэлеграму ад Адама Мальдзіса пра заўчасную смерць нашага агульнага сябра, мы ўсе разам адразу ж вырушылі ў Мінск. А перад гэтым на ракаўскіх палях сабралі вялізны, не раўнуючы як сноп, букет з жытнёвых каласоў. З васільковым пярэвяслам, ён сімвалічна вылучаўся сярод мора чырвоных і белых ружаў, гваздзікоў, што ўкрылі магілу Уладзіміра Караткевіча (мал. 2).

Неаднойчы Караткевіч чытаў па памяці ў арыгінале творы Тараса Шаўчэнкі, раіўся са мною ў напісанні ўкраінскіх слоў. З маімі бацькамі, якія жылі тады ў Львове, трывала ліставаўся, дасылаючы ім усе свае новыя творы. А калі яны прыязджалі да нас, Валодзя ў застольнай бяседзе прачула спяваў з бацькам украінскія рамансы і народныя песні. Ён вельмі любіў Ракаў, дзе яго заўсёды гасцінна сустракалі старэйшыя Рагойшы. У Ракаве ад свёкра, пры жыцці якога ўлады мяняліся адзінаццаць разоў (!), Караткевіч спасцігаў складаную гісторыю XX ст. Ракаў ён успрымаў як сэрца Беларусі, любіў яго фальклорныя каляндарна-абрадавыя святы, чэрпаў з гаючай крыніцы народнай беларускай мовы. Бо Ракаў – на шляху да яго Гародні, дзе «Хрыстос прызямліўся», адсюль рукой падаць да Гальшанаў, дзе ўзвышаўся калісьці «Чорны замак... (Г)Альшанскі»! Часта паўтараў, што ўдзячны лёсу, які падараваў шчасце мець дзве бацькаўшчыны: Беларусь яго нарадзіла,Украіна выхоўвала. І гэтыя прызнанні Караткевіча рабілі нас яшчэ раднейшымі. На яго ўкраінскае выданне «Земля під білими крилами» львоўскі часопіс «Жовтень» надрукаваў маю рэцэнзію. Калі Валодзя ўбачыў яе, ён страшэнна ўзрадаваўся. Чаму? Найперш яго ўзрадавала назва – «Країна під білими крилами бусла». Выявілася, што менавіта так ён хацеў назваць сваю кнігу пра Беларусь – краіна. Аднак выдаўцы не дазволілі: слова «краіна» выклікала ў іх, як ён казаў, «крамольную асацыяцыю з самастойнасцю, незалежнасцю»…

Упершыню ж я Уладзіміра Караткевіча, як і многіх іншых вядомых беларускіх пісьменнікаў і вучоных (Ніла Гілевіча, Алега Лойку, Адама Мальдзіса, Фёдара Янкоўскага, Язэпа Семяжона, Сяргея Панізьніка, Валянціна Рабкевіча, Міколу Прашковіча і інш.), сваякоў і суседзяў-ракаўцаў (Налецкіх, Васілеўскіх, Біруляў, Руткоўскіх, Кайровічаў і інш.), убачыла ў Ракаве на пачатку лістапада 1967 г. на нашым з Вячаславам Рагойшам «вяселлі веку» (так назвалі тую падзею Караткевіч і Мальдзіс). Тады ж Уладзімір Сямёнавіч (пазней для мяне ён стаў проста Валодзем) напісаў і прачытаў сваю вясельную «Эпіталаму Таццяне і Славе». З таго часу і пачалася наша дружба. З цёплымі надпісамі ён дарыў нам, бадай, усе свае арыгінальныя выданні. Уладзімір Караткевіч неаднойчы гасцяваў і адпачываў у нас у Ракаве, спыняўся ў бацькоўскім доме Вячаслава Пятровіча часам на некалькі дзён. Аднойчы, калі, ажаніўшыся, мяняў мэблю, прапанаваў нам забраць у Ракаў сваю «халасцяцкую» канапу: «Адвязіце ў Ракаў, магчыма, на ёй я і паначую там у вас» (дарэчы, як музейны экспанат, канапа захоўваецца ў нас і зараз). З Валодзем мы (а пасля яго жаніцьбы і разам з ягонай жонкай Валянцінай) на нашых «Жыгулях» неаднойчы калясілі па ваколіцах Ракава (Монькі, Пярэжары, Душкава, Люцінка, Івянец...). У Караткевіча была мара набыць лецішча каля Ракава. Мара, на жаль, не ажыццявілася. У перадапошняе ягонае лета мы цэлы дзень правялі ў цудоўнай мясціне на беразе Іслачы – на Рынкавым Балоце каля Пярэжар. Па дарозе туды мы спыняліся ля Белага Слупа – месца пахавання французскіх салдат падчас вайны 1812 г., наведалі Пярэжарскія праваслаўныя могілкі, дзе вечным сном спяць Іосіф і Алена Рагойшы – дзед і бабка Вячаслава Пятровіча... Захавалася нямала здымкаў з таго памятнага дня.

А ў 2011 г. у Ракаве на доме № 17, што на Плошчы Свабоды, з'явілася мемарыяльная шыльда работы народнага мастака Беларусі Івана Міско з выявай профіля пісьменніка і словамі: «Гэты дом неаднойчы па-сяброўску наведваў класік беларускай літаратуры Уладзімір Караткевіч» (мал. 3).

**Каментарыі:**

1. Газету «Ракаўскі шлях» выдаваў у 1990–2000-х гг. доктар філалагічных навук, прафесар Вячаслаў Рагойша – у гонар свайго роднага мястэчка са старадаўняй і змястоўнай гісторыяй.
2. На палатне Фелікса Янушкевіча зверху – выявы гістарычных постацей ад К. Тураўскага да І. Мележа. Бел-чырвона-белую труну з У. Караткевічам нясуць П. Панчанка, Ф. Янкоўскі, Я. Сіпакоў, Я. Брыль, А. Лойка.

**Спіс літаратуры:**

1. Кабржыцкая, Т. Дзядзька Валодзя, Валодзя, Уладзімір Караткевіч / Таццяна Кабржыцкая // Наш гонар – Ракаў : да 550-годдзя Ракава / укл., падр. тэкстаў В. Рагойша; рэд. кал. Т. Кабржыцкая [і інш.]. – Мінск : Рэгістр, 2015. – С. 43–44.
2. Кабржыцкая, Т. Бадровы на Ракаўшчыне / Таццяна Кабржыцкая // Наш гонар – Ракаў : да 550-годдзя Ракава / укл., падр. тэкстаў В. Рагойша; рэд. кал. Т. Кабржыцкая [і інш.]. – Мінск : Рэгістр, 2015. – С. 51.

*Георгиос Мацукатов*

**ВИЛЬНЮССКИЙ СЛЕД ВЛАДИМИРА КОРОТКЕВИЧА**

*В статье с точки зрения жителя столицы Литвы описан опыт знакомства известного белорусского писателя, поэта, драматурга и сценариста В. Короткевича с Вильнюсом 1960-х гг., а также события в Литве, связанные с предметом его профессиональных интересов и творческим наследием.*

*Georgios Matsukatov*

**VILNIUS TRACE OF VLADIMIR KARATKEVICH**

*This study, from the point of view of a resident of the capital of Lithuania, describes the experience of acquaintance of the famous Belarusian author V. Karatkevich with Vilnius of the 1960s, as well as events in Lithuania related to the subject of professional interests and the creative heritage of this writer, poet, playwright and screenwriter, close by 2019–2020.*



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ